# *АХ, КАЛЯДАЧКІ*
# *або*
# *ПАВАРАЖЫ НАМ, САЮЗ ПІСЬМЕННІКАЎ!*

**12 студзеня члены клуба «Ветэран» пры гарадской бібліятэцы № 10 сабраліся на стаўшы ўжо традыцыйным калядны вечар.**

Усе тыя, хто па гэтую пару не верыў у чараўніцтва, паверылі ў яго пасля варажбы, як даўней, але па новых кнігах сваіх, родных і любімых аўтараў – Людмілы Антонаўны Кебіч, Дзмітрыя Радзівончыка, Таццяны Сучковай, Пятра Сямінскага і іншых.

Сапраўдны чараўнік, якім стаў член Саюза пісьменнікаў Беларусі, Пётр Яраслававіч Сямінскі, вядомы на Гродзеншчыне паэт, празаік, парадыст пад мігаценне свечак і чароўную музыку кампазітара Аляксандра Маркелава чытаў прадказанні на 2018 год. Гучалі вершы, песні і казкі. І зала замірала ад таленавітых і, як хочацца верыць, прарокавых радкоў вядомых гарадзенскіх аўтараў.

Бліскучы сцэнар свята, напісаны Пятром Яраслававічам, нікога не пакінуў абыякавым. Сімпатычныя кікімары, сяброўкі-весялушкі, чараўнік і іншыя персанажы, што выйшлі з-пад яго таленавітага пяра, так весялілі залу, што, здавалася, ніхто не ўспомніць аб рэальнасці. Настолькі ўсе ўвайшлі ў ролі.

Будзем чакаць наступнага года, каб на кнігах, якія выйшлі ўжо ў 2018 годзе, на калядкі ізноў навaражыць усім шчасця. Дзякуй вам, нашы любімыя аўтары!

**Святлана КАЗБАНАВА,**
**загадчык гарадской бібліятэкі № 10 г. Гродна**

**На здымках:** падчас традыцыйнага каляднага вечара ў клубе "Ветэран", што дзейнічае пры бібліятэцы № 10 г. Гродна. У "літаратурнай варажбе" прымаюць удзел члены клуба "Ветэран"; член СПБ, паэт, празаік Пётр Сямінскі; гродзенскі кампазітар і музычны педагог Аляксандр Маркелаў**.**




YAMAHA


С Новым годом!